а границы между реальным и фантастическим затираются, становятся размытыми и нечёткими. На продолжение сна указывают лишь отдельные слова матери, к которой приехал герой: “*Я должна даже после смерти с тобой спорить? Я всегда хотела лучшего для тебя… Жаль, что этой записной книжки (записной книжки отца) я не нашла при жизни…*” [3, с. 35–36][1].

Мистификация продолжается и после пробуждения героя от телефонного звонка. Позвонивший ему человек извиняется за то, что он не присутствовал на юбилее и поздравляет его.

В *“Последней раздаче”* имеет место сон, который “никогда не приснился”, а был выдуман молодым героем, чтобы поддержать с Марией разговор и срыть свою стеснительность. Однако в этом вымышленном сне герои засыпают вместе, а просыпается только он, что, по мнению Марии, является плохим знаком. Спустя много лет, в очередном письме она жалеет, что тогда не проснулась.

Сну посвящена одна из лучших картин героя “Девочка со спящей куклой”, на которой он нарисовал ещё меленькую Марию, изображая эпизод их первой встречи в темном судебном коридоре. Именно эта картина, увиденная уже юной Марией на выставке, связала героев.

Таким образом, можно заключить, что мотив игры, используемый Мысливским, выполняет несколько функций: сюжетообразующую, философско-аллегорическую, социальную, эстетическую. Также можно выделить несколько видов игры: непосредственно игра в покер; игры, в которые играют люди; игра воображением читателя. Мотив игры также позволяет выявить многие проблемы и вопросы, которые автор поднимает в *“Последней раздаче”*.

О своем романе автор говорит так: “Я хотел написать что-то, у чего нет конца, что состоит из таинственных, не до конца проясненных вещей, что свидетельствовало бы о том, как труден путь к самопознанию. Каких усилий воли требует поиск ответа на вопрос: кто я такой, кто такой современный человек?” [1].

**Список литературы**


1 Новая Польша [Электронный ресурс] : журнал / Институт Книги Польши – Электрон. журн. – Соболевская, От книги мне нужно выздороветь. – Варшава : 2014. – № 5. – Режим доступа к журн. : http:/www.novpol.ru/ index.php?id=2079

2 Gazeta wyborcza [Электронный ресурс] : magazyn świąteczny. – Электрон. газета. – Subbotko, Żyło się pod niebem bardziej. – Warszawa : 2013. – Режим доступа : http: /wyborcza.pl/ magazyn/1,134494,14719844, Zylo_sie_pod_niebem_bardziej.html

3 Myśliwski, W. Ostatnie rozdanie / W. Myśliwski. – Kraków : Wydawnictwo Znak, 2013. – 445 s.

4 Tygodnik Polityka [Электронный ресурс]: tygodnik. – Электрон. журн. – Sobolewska, Sztuka tracenia. – Warszawa : 2013. – Режим доступа к журн. : http:/www.polityka.pl/tygodnikpolityka/kultura/ 1553921,2,nowa-powiesc-wieslawa-mysliwskiego.read



УДК 821.161.3`06-4-94



А. А. КАЦЮРГІНА
(г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)


## ЭСЭ ЯК ФЕНОМЕН СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КРЫТЫКІ


Прадметам даследавання з’яўляецца сучаснае беларускае крытычнае эсэ. Адзначаны феномен мае шырокае распаўсюджанне сёння ў сувязі з агульнай тэндэнцыяй да адлюстравання падкрэслена


[1] Mam się jeszcze po śmierci z tobą sprzeczać? Zawsze dobrze chciałam dla ciebie… Szkoda, że tego notesu za życia nie znalazłam…




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

суб’ектыўнай пазіцыі аўтара як у мастацкім, так і ў літаратурна-крытычным тэксце. Па гэтай прычыне вартым з’яўляецца заглыблены аналіз згаданга феномена.

Мэтазгоднасць існавання ацэнкі твора сфармулявана многімі даследчыкамі і працягвае асэнсоўваецца дагэтуль. Яшчэ на пачатку XX стагоддзя выдатны беларускі пісьменнік і гісторык літаратуры М. Гарэцкі сцвярджаў, што “крытыкаваць – значыць шукаць таго ж, чаго шукаў аўтар, і рабіць думку яго яснейшай чытачу, і даводзіць, ці добра выклаў думку аўтар і як выклаў і як бы мог выкласць лепей” [1, с. 187]. Ужо ў канцы гэтага ж стагоддзя вядомы даследчык сучаснай літаратуры В. Каваленка пачынае настойваць на своеасаблівай сутворчасці мастака слова і таго, хто ацэньвае напісанае ім: “…крытыка мае на гэта права, і яно выцякае з яе спецыфікі. Вядома, неабавязкова, каб кожны крытык заўсёды дапісваў за пісьменніка дыялогі, цэлыя старонкі тэксту. Сутнасць гэтага права ў іншым – не толькі абагульніць пэўную з’яву, але разам з тым абагульніць праз «прадаўжэнне» гэтай з’явы, праз большую гушчыню і насычанасць жыцця, бачачы ўсе магчымыя вынікі яе далейшага лёсу” [2, с. 35].

Сённяшняя крытыка, у якой развіваецца згаданая тэндэнцыя да сутворчасці, набліжаецца да рэцэптыўнай, прычым суб’ектамі рэцэпцыі ў ёй нярэдка становяцца самі даследчыкі. Неабходна падкрэсліць, што істотнай асаблівасцю сучаснай ацэнкі твора з’яўляецца праяўленне ў ёй якраз “асобаснасці”, суб’ектыўнасці. Пэўным вынікам дадзенага працэсу менавіта і абумоўлена ўзнікненне феномена эсэісцкай крытыкі, “якая не прэтэндуе на аналітычнасць і доказнасць” [3, с. 88].

Таксама трэба адзначыць, што ў сённяшнім поліцэнтрычным свеце з яго актыўнымі інтэграцыйнымі працэсамі, зрухамі культурнай парадыгмы і адначасовай павышанай рэфлексіяй суб’екта асабліва ўзмацняецца роля такой адметнай формы творчага мыслення, як эсэізм. Маштабнасць дадзенай з’явы ў сучаснай прасторы падкрэслівае Г. Кісліцына. На яе думку, “эсэізацыя не замыкаецца колам літаратуры, а становіцца агульнакультурным феноменам, які, калі згадзіцца з Эпштэйнам, можна азначыць як рух да жыцця – думкі – вобразнага сінтэзу” [4, с. 21].

Сапраўды, па слушным перакананні ўзгаданага вядомага даследчыка М. Эпштэйна, “эсэізм з’яўляецца напрамкам значна больш шырокім і магутным, чым любое з філасофскіх або мастацкіх напрамкаў, шырэй, чым фенаменалогія або экзістэнцыялізм, сюррэалізм або экспрэсіянізм – менавіта таму, што ён не ёсць кірунак адной з культурных галін, а ёсць адмысловая якасць ўсёй сучаснай культуры, усёабдымная галіна творчай свядомасці, якая стаіць над тымі плынямі, што ў яе ўліваюцца, як і міфалогія, з якой усе яны аб’ядналіся, злучаючы рознае: вобраз і паняцце, выдумку і рэчаіснасць, але не знішчаючы іх самастойнасці” [5, с. 377–378].

Зварот сучасных пісьменнікаў да жанру эсэ абумоўлены не толькі імкненнем усяго мастацтва да цэласнасці, але і збліжэннем вобразнага і паняційнага ўнутры самой культуры ці той жа літаратуры. Таксама нельга не адзначыць антрапацэнтрычную скіраванасць сучаснай філалагічнай навукі, яе зварот да духоўнай іпастасі асобы, што спрыяе развіццю эсэістычнага мыслення, якое характарызуецца суб’ектыўнасцю, выяўленнем уласнага “Я” аўтара.

Відавочна, што вывучэнне зместава-фармальнай спецыфікі эсэ з’яўляецца актуальнай праблемай сучаснага літаратуразнаўства. Пры гэтым некаторыя даследчыкі (Н. Лейдарман, Л. Купрыяноўскі, З. Кірнозэ, Г. Цвайг і інш.) адносяць эсэ да “літаратуры факта”, “дакументальна-мастацкай літаратуры”. Але найбольш часта сярод устойлівых жанравых прыкмет эсэ навукоўцамі называюцца наступныя: суб’ектыўная ўстаноўка аўтара; свабодная форма выкладу; адвольная кампазіцыя; наяўнасць канкрэтнай тэмы; выкарыстанне сродкаў мастацкай выразнасці; адносна невялікі аб’ём тэксту і інш. Так, паводле меркавання В. Рагойшы, у значнай ступені для эсэ ўласціва “падкрэсленая суб’ектыўнасць выказвання, свабодная кампазіцыйная структура твора. У ім празаічная мова нярэдка пераходзіць у вершаваную,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

само ж апавяданне падчас набывае выразную паэтычна-вобразную афарбоўку, афарыстычную сцісласць і трапнасць” [6, с. 290].

Думаецца, што з усіх разнавіднасцей дадзенай мастацкай формы па гэтых жа крытэрыях варта вылучаць і літаратуразнаўчае эсэ. Тым больш, што актыўныя творчыя пошукі сучасных беларускіх аўтараў даюць усе падставы для разгляду літаратуразнаўчага эсэ як феномена сучаснай крытыкі. І паколькі на сённяшнім этапе літаратурнага развіцця дамінуе тэндэнцыя да эсэізацыі і скарачэння фармальнага аб’ёму тэкстаў, гэта не можа не ўзмацняць інтарэсу да вывучэння жанрава-відавых адметнасцей літаратуразнаўчага эсэ і выяўлення адметнасцей яго функцыянавання як у творчасці кантрэтных аўтараў, так і ва ўсім культурна-мастацкім працэсе.

Пры выбары напрамку далейшага аналізу літаратуразнаўчага эсэ неабходна ўлічваць, што тэксты дадзенага тыпу магчыма інтэрпрэтаваць толькі з улікам міжтэкставай матывацыі. Пры гэтым дамінантнымі крытэрыямі даследавання могуць быць абраны стыль і манера, камунікатыўная мэта крытыка, асаблівасці яго светабачання, біяграфічныя рэаліі, жыццёвы вопыт і інш. Абмяжоўвацца ж пры разглядзе дадзенай разнавіднасці эсэ толькі ўнутрытэкставай матывацыяй практычна немагчыма, паколькі наогул фармальная арганізацыя гэтага жанру даволі няўстойлівая.

Несумненна, што ў ХХ стагоддзі эсэ перажывае сапраўдны росквіт. Менавіта “рэпартажы, лірычныя, паэтычныя эсэ, успаміны, біяграфічныя навелы і тое, што мы перш называлі навукова-папулярнай літаратурай – усе гэтыя “несюжэтныя”, “перыферыйныя” жанры раптам вырваліся з свайго літаратурнага бяспраўя і займаюць ў пэўных умовах нават вядучую ролю. Яны сталі важнай, неад’емнай і, вядома, не “перыферыйнай” часткай літаратуры” [7, с. 41].

У беларускай літаратуры ў другой палове ХХ стагоддзя пашыраюцца такія разнавіднасці эсэ, як філасофска-псіхалагічнае (“Жменя сонечных промняў” Янкі Брыля), літаратурна-крытычнае (“Загадка Багдановіча” М. Стральцова), белетрызаваны рэпартаж (“Хатынь: боль і гнеў” А. Бялевіча), падарожныя (кнігі Я. Пархуты), літаратуразнаўчыя эсэ (“Казкі янтарнай краіны”, “Saxifraga” У. Караткевіча), гістарычна-краязнаўчае эсэ (яго ж “Зямля пад белымі крыламі”, “Зямля бацькоў” Б. Сачанкі, “Зялёны лісток на планеце Зямля” Янкі Сіпакова) і інш. У сучасных крытыкаў асаблівай папулярнасцю карыстаюцца эсэізаваныя літаратурныя партрэты, прадстаўленыя ў кнігах “За дальнім прычалам” (2007) А. Кудраўца, “Пад небам беларускага слова: пра пісьменнікаў, літаратуру і не толькі” (2007) А. Бутэвіча, “Хадзі на мой голас” (2008) Д. Бічэль-Загнетавай, “У святой краіне выгнання” (2011) А. Сямёнавай. Вызначыўшы асноўныя зместава-фармальныя паказчыкі гэтай арыгінальнай крытычна-мастацкай адзінкі, мы вылучылі і такія яе жанравыя мадыфікацыі, як літаратурна-філасофскае эсэ (А. Разанаў), літаратуразнаўчае эсэ з элементамі лінгвістычнага даследавання (В. Зуёнак), пятрогліфы і філалагемы (П. Васючэнка) і інш. У інтэрнэт-прасторы атрымалі шырокае распаўсюджанне эсэізаваныя водгукі П. Абрамовіча, Л. Алейнік, А. Бязлепкінай, Г. Кісліцынай, М. Мартысевіч, А. Паплаўскай і інш.

Згодна з гістарычна замацаванай традыцыяй эсэізм у сучаснай беларускай літаратуры выяўляе сябе ў шматлікіх жанравых разнавіднасцях эсэ. У тым ліку – літаратуразнаўчым. Аналізуючы стан сучаснай беларускай крытыкі, І. Шаўлякова слушна адзначае, што “на самой справе ў нас медытацыі з нагоды нават леташніх тэкстаў усё часцей набываюць літаратуразнаўчую інтанацыю ды пафас” [8, с. 10]. Даследчыца канстатуе “пераразмеркаванне крытычнай актыўнасці”, паколькі “цэлая плеяда аўтарытэтных крытыкаў (Л. Сінькова, Е. Лявонава, П. Васючэнка, С. Кавалёў, Г. Тычко і інш.) “мігравала” ў нетры ўласна літаратуразнаўства” [9, с. 330]. І. Шаўлякова таксама пацвярджае факт павышэння аўтарытэтнасці навукі пра мастацтва слова ў апошнія дзесяцігоддзі: “І без «рэестравага» знаёмства з набыткамі літаратуразнаўства, абапіраючыся толькі на своеасаблівую «настраёвасць» літаратурнай прасторы 2000-х, можна зрабіць выснову, што згаданыя набыткі шануюцца як бы па змоўчанні” [9, с. 327].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вывучэнне аўтарства крытычных твораў беларускай літаратуры дазваляе сцвярджаць, што літаратуразнаўчае эсэ як форму крытычнага роздуму ў першую чаргу абіраюць прафесійныя літаратары (Л. Галубовіч, В. Зуёнак, С. Дубавец, П. Васючэнка, А. Разанаў, Ю. Сапажкоў, К. Цвірка), а таксама літаратуразнаўцы і крытыкі (Л. Алейнік, Г. Кісліцына, Ц. Чарнякевіч і інш.). Зварот аўтараў з высокай філалагічнай культурай і вопытам літаратурнай творчасці да гэтага жанру абумоўлены разняволенымі, антыдагматычнымі якасцямі эсэ і магчымасцю рэалізацыі ў межах тэксту права на самараскрыццё асобы мастака, свабоду выбару ім адпаведных спосабаў уздзеяння на чытача. І. Шаўлякова адзначае, што "менавіта жанр эсэ (у варыянце надзвычай зручным, то бок прыстасаваным да патрэб чарговага «пераходнага перыяду») дазваляе крытыку быць максімальна вольным" [8, с. 158]. Зразумела, што не могуць не ўплываць на суб'ектыўную рэфлексійнасць, не ўзмацняць ролі адметнай формы эсэістычнага творчага мыслення актыўныя інтэграцыйныя працэсы, зменлівасць культурнай парадыгмы ў сённяшнім свеце.

Згодна з гістарычна замацаванай традыцыяй эсэізм у беларускай літаратуры выяўляе сябе ў шматлікіх жанравых разнавіднасцях эсэ. У тым ліку – літаратуразнаўчым. Пры разглядзе творчых наробкаў Л. Галубовіча, Ю. Сапажкова, А. Разанава, В. Зуёнка, П. Васючэнкі, С. Дубаўца і інш. можна зрабіць выснову, што сярод устойлівых характарыстык жанру найбольш істотна выяўляюць сябе ўзмацненне суб'ектыўнага пачатку, крытычная рэфлексія, вобразнасць мыслення пісьменніка, метафарызацыя тэксту, яго фрагментарнасць.

Скажам, пры адрознай манеры падачы матэрыялу і тэматыцы аўтараў кніг крытыкі "Сыс і кулуары" (Л. Галубовіч) і "Меж духом и словом" (Ю. Сапажкоў) найперш цікавяць постаці і праявы літаратурнага працэсу апошніх дзесяцігоддзяў. І калі першы з даследчыкаў ужо ў назве кнігі акрэслівае кропку адліку вышыні і самабытнасці сапраўднага таленту праз зварот да творчасці нашага паэта-земляка, то другі абапіраецца пераважна на вопыт рускіх пісьменнікаў. Паэтызацыя і метафарычнасць як асноўныя характэрныя рысы тэкстаў С. Дубаўца, гульнёвы пачатак, фрагментарнасць аналізу ў крытычных рэфлексіях П. Васючэнкі прыводзяць пісьменнікаў не толькі да канцэптуальна новых высноў адносна сучаснага літаратурнага працэсу, але і новых ракурсаў бачання гісторыі мастацтва слова.

У кнізе "Паміж небам і зямлей" В. Зуёнак імкнецца акрэсліць уласнае бачанне гісторыі прыгожага пісьменства праз эвалюцыю мовы і ўлік уздзеяння на мастацкі тэкст яе асобных кампанентаў. Актуалізацыя філасофскага і лінгвістычнага пачаткаў у дадзеным выпадку толькі на карысць літаратуразнаўчага аналізу, спрыяе абнаўленню яго метадалогіі і шматузроўневай ацэнцы мастацкіх тэкстаў.

Пра запатрабаванасць і прадуктыўнасць функцыянавання літаратуразнаўчага эсэ ў сучаснай беларускай крытыцы сведчыць зборнік літаратурна-філасофскіх эсэ "З апокрыфа ў канон" А. Разанава. У дадзеным выпадку трэба гаварыць пра кнігу пісьменніка як герменеўтычны выклад фенаменальнай аўтарскай канцэпцыі адносна гісторыі сусветнай культуры і айчыннай літаратуры, аналізу яе асобных з'яў, разумення творцы як носьбіта ідэі (эсэ "Нататкі на дубовых лістах", "Скрыжаванне Францішка Багушэвіча", "Дайсці да першага слова малітвы" і інш.). А. Разанава характарызуе погляд на беларускую літаратуру як на дыскрэтную з'яву, якую мэтазгодна разглядаць ў дыяхраніі. Паэт-крытык прытрымліваецца думкі, што літаратурная спадчына павінна стаць "сучаснай рэальнасцю", каб "быць пастаянна гатовай для ўзаемадзеяння з наступнымі пакаленнямі" [10, с. 82].

Творы К. Камейшы, дзе арганічна спалучыліся элементы мемуарнай прозы, рысы публіцыстычнага стылю і пісьменніцкай эсэістычнай крытыкі, гэтаксама як і сінтэз думкі і пачуцця ў развагах Людкі Сільновай, метафізічная прастора тэкстаў І. Шаўляковай, сінкрэтызм біяграфічнага і аналітычнага пачаткаў у працах Л. Алейнік, арыентацыя на эстэтычныя крытэрыі разам з разняволенасцю мыслення ў даследаваннях Ц. Чарнякевіча, даюць усе падставы сцвярджаць, што іх нельга назваць літаратуразнаўчымі эсэ ў чыстым выглядзе.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

І ўсё ж асобныя адзнакі гэтага жанру ў творчасці ўзгаданых і многіх іншых аўтараў прадуктыўна сцвярджаюць сябе ў сучаснай навуцы пра прыгожае пісьменства, тым самым спрыяючы росту аўтарытэту і доўгачаканаму абнаўленню як бягучай крытыкі, так і акадэмічнага літаратуразнаўства.

**Спіс літаратуры**


1 Гарэцкі, М. Развагі і думкі / М. Гарэцкі // Александровіч, С. Х., Александровіч, В.С. Беларуская літаратура XIX – пачатку XX ст. Хрэстаматыя крытычных матэрыялаў. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1978. – С. 184–188.

2 Каваленка, В. А. Праблемы сучаснай беларускай крытыкі / В. А. Каваленка. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1977. – 192 с.

3 Яцухна, В. І. Тэорыя літаратуры: дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей ВНУ / В. І. Яцухна; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. – 279 с.

4 Кісліцына, Г. М. Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры [Тэкст] / Г. Кісліцына. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – 118 с.

5 Эпштейн, М. Парадоксы новизны [Текст] / М. Эпштейн. – М.: Советский писатель, 1988. – С. 331–381.

6 Рагойша, В. П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. – Мінск: Нар. асвета, 2009. – 303 с.

7 Гаек, И. Литература факта / И. Гаек // Вопросы литературы. – 1965. – № 12. – С. 38–49.

8 Шаўлякова, І. Л. Сапраўдныя хронікі Поўні : артыкулы і рэцэнзіі / Ірына Шаўлякова. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 184 с.

9 Шаўлякова, І. “Рэпутацыя” пасля (аўта)дыскваліфікацыі. Беларуская літаратурная крытыка 2000-х / І. Шаўлякова // Дзеяслоў. – 2012. – № 60. – С. 326–330.

10 Штэйнер, І. Ф. Уводзіны ў невымоўнае: філасофія паэзіі Алеся Разанава / Іван Штэйнер. – Мінск: Выдавецкі дом “Звязда”, 2013. – 252 с.


УДК . 821.161.2–6.09 (092) Чендей І.

С. С. КІРАЛЬ
(м. Київ, НУБіП України)

## ЕПІСТОЛЯРІЙ ІВАНА ЧЕНДЕЯ ЯК ІДЕНТИФІКАЦІЯ НАЦІОНАЛЬНОЇ САМОБУТНОСТІ МИТЦЯ

У артыкуле на матэрыяле апублікаваных і неапублікаваных лістоў вядомага ўкраінскага пісьменніка, лаўрэата Нацыянальнай прэміі імя Тараса Шаўчэнкі Івана Чендея (1922–2005) ажыццёўлена спроба раскрыць вытокі таленту і асаблівасці творчай індывідуальнасці мастака, адлюстраваны яго погляды на літаратурную крытыку, разважанні пра жанравай прыродзе навелы і апавяданні, творы сучаснікаў і класікаў украінскай літаратуры.

Листи І. Чендея, лауреата Національної премії України імені Тараса Шевченка, “закарпатського короля Ліра” (Г. Корабельников), до Д. Бедзика, І. Денисюка, М. Жулинського, Л. Забашти, Л. Коваленка, А. Малишка та інших письменників і науковців, літературних критиків відтворюють становлення письменника, розкривають витоки його таланту, особливості творчої індивідуальності митця. Вони наповнені “живими цюхвилинними деталями і переживаннями” (М. Коцюбинська) та інкрустовані “крихтами з інтелектуального столу” (Ю. Шерех), яких тут багато, як і “цюхвилинних деталей і переживань”, адже “інтелектуальний стіл” І. Чендея виявився щедрим на гірку правду, болючі роздуми про людей і літературу, про Україну та її мову, на філософські розмисли про

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ